*Юрыдычнаму факультэту БДУ - 80 гадоў*

*Т.І. ДОЎНАР*

# ГІСТОРЫКА-ПРАВАВАЯ НАВУКА БЕЛАРУСІ: ЭТАПЫ І АСАБЛІВАСЦІ

Рассматриваются периоды зарождения, становления и развития белорусской историко-правовой науки. Акцентируется внимание на характерных особенностях и проблемах, связанных с ее этапами, а также - на современных задачах юриспруденции.

The article deals with the origin, formation and development of the history of law as a science. Special attention is paid to a range of peculiarities and problems related to the step-by-step development of the history of law. The key goals of modern science are also emphasized.

Прававая навука, як ніякая іншая галіна пазнання, арганічна звязана з дзяржаўнай арганізацыяй грамадства. Вытокі яе трэба шукаць у далёкай старажытнасці. Менавіта з узнікненнем дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі (Полацкага, Турава-Пінскага, Берасцейскага, Навагародскага і іншых княстваў) з'явілася патрэба ў асобнай групе людзей - тлумачальнікаў і захавальнікаў звычаяў.

Пазней, калі беларускія землі сталі палітыка-эканамічным цэнтрам буйной феадальнай дзяржавы - Вялікага княства Літоўскага, у межах якой перапрацоўвалася звычаёвае права старажытных дзяржаў у агульназемскае (агульнадзяржаўнае) права, усё больш праяўляецца тэндэнцыя тэарэтычнага асэнсавання новых палітыка-прававых з'яў і грамадскіх працэсаў, асабліва ў XVI ст., калі ў дзяржаве наспелі перадумовы правядзення шырокіх рэформаў (зямельнай, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай, ваеннай, судовай, адукацыйнай і інш.) і адпаведна ўзнікла патрэба сістэматызаваць заканадаўства. Новым працэсам у дзяржаве садзейнічала актывізацыя палітыка-прававой думкі, якая з'явілася фактычна тэарэтыка-ідэалагічнай падставай новай, параўнальна больш прагрэсіўнай грамадскай правасвядомасці.

У гэты перыяд наглядаецца тэндэнцыя фарміравання кола мысліцеляў і палітычных дзеячаў (Францыск Скарына, Міхалан Літвін, Сымон Будны, Андрэй Волан, Мікалай Радзівіл Чорны, Астафій Валовіч, Леў Сапега і інш.), якія не толькі даследуюць праблемы дзяржавы і права, але ўносяць практычныя прапановы па ўдасканальванню грамадскіх адносін і заканадаўства.

Вучоныя імкнуліся аб'яднаць прававую тэорыю з практыкай, што практычна рэалізавалася пры стварэнні новых сістэматызаваных законаў, заснаваных на мясцовым праве і традыцыях народа, - Статутаў 1529, 1566, 1588 гг., якія былі напісаны на беларускай мове і змяшчалі нормы ўсіх галін феадальнага права.

Пашырэнне на Беларусі рэфармацыйных і рэнесансных ідэй садзейнічала свецкай інтэрпрэтацыі палітыка-прававых інстытутаў, аб чым сведчаць кнігі А. Волана і А. Алізароўскага, Л. Зізанія, П. Скаргі, М. Сматрыцкага, В. Цяпінскага і іншых мысліцеляў[1].

Такія прадстаўнікі рэфармацыйнага руху на Беларусі, як П. Гезка, М. Чаховіц, С. Будны, В. Цяпінскі і іншыя, ужо непасрэдна займаліся праблемамі сутнасці права і найбольш дасканалага прававога рэгулявання грамадскіх адносін. Так, С. Будны пісаў, што ўсе службовыя асобы павінны быць «богабаязнымі, спра вядлівымі, сумленнымі і міласэрнымі. Яны мусяць ведаць законы, мець высокую адукацыю, быць акуратнымі і спраўнымі, а галоўнае - не ласымі на чужое і не хцівымі»[2].

Пашырэнне сферы прававога рэгулявання, а таксама рэфармаванне судо-вай сістэмы ў XVI ст., у выніку якой былі створаны выбарныя, аддзеленыя ад выканаўчай улады суды для шляхецкага саслоўя, павялічвала патрэбу ў юры-дычных кадрах. У гэты перыяд зараджаецца інстытут прафесійных суддзяў, па-чынае фарміравацца інстытут прафесійнай адвакатуры, што адлюстравалася ў заканадаўстве. Статут 1588 г. утрымлівае ўжо шмат артыкулаў, прысвечаных па-радку выбараў суддзяў, правам і абавязкам адвакатаў, возных і інш.[3] Ён нават гаворыць аб тым, каб сіратам і бедным людзям адвакаты прызначаліся бясплат-на. Галоўнае, што закон патрабуе ў органы мясцовага кіравання выбіраць асоб "в праве умеетных"[4]. Прафесійныя юрыдычныя кадры рыхтавалі ў XVI ст. не толькі заходнееўрапейскія універсітэты, але і ўласныя навучальныя ўстановы (напрыклад, створаная ў Вільні ў 1566 г. Святаянская школа грамадзянскага права). Прававыя веды імкнуліся даць іншыя навучальныя ўстановы - Слуцкае кальвініскае вучылішча, арыянскія школы ў Іўі, Клецку, Койданаве, Любчы, Лоску, Нясвіжы, Навагрудку, якія былі створаны на Беларусі ў перыяд Рэфармацыі і інш.

У найстарэйшай вышэйшай навучальнай установе Беларусі - Віленскім уні-версітэце (заснаваны ў Вялікім княстве Літоўскім у 1570 г. езуітамі як калегіум) быў адчынены ў 1641 г. юрыдычны факультэт. Кароль Стэфан Баторый у 1578 г. выдаў прывілей (зацверджаны 30.10.1579 г. булай папы Грыгорыя XIII), на пад-ставе якога калегіум быў пераўтвораны ў акадэмію, што давала права прысвой-ваць вучоныя ступені. Паводле некаторых падлікаў з 1583 па 1781 г. выпус-кнікам было прысвоена 4076 навуковых ступеняў, у тым ліку 149 - па праву[5,6].
Першым рэктарам акадэміі стаў ідэолаг контррэфармацыі, знакаміты мысліцель П. Скарга. Сярод найбольш вядомых выпускнікоў акадэміі - М. Сматрыцкі, С. Полацкі, К. Сарбеўскі, А. Каяловіч, А. Алізароўскі і інш.

Шмат зрабіла ў галіне адукацыі і навукі Адукацыйная камісія Рэчы Паспа-літай (амаль што першае ў Еўропе міністэрства адукацыі), якая правяла рэфор-му Віленскай акадэміі, пераўтварыўшы яе з духоўнай у свецкую ўстанову (з 1781 г. яна называлася Галоўнай школай ВКЛ).

Пасля далучэння Беларусі да Расіі Галоўная школа ВКЛ у 1803 г. была рэар-ганізавана ва універсітэт з чатырма факультэтамі: маральных і палітычных на-вук, фізіка-матэматычным, медыцынскім, літаратурным і вольных мастацтваў. У ім выкладалі 34 прафесары і 12 ад'юнктаў (памочнікаў прафесараў), якія ў сваіх лекцыях і навуковых працах закраналі гістарычныя і гісторыка-прававыя праб-лемы, звязаныя з мінулым беларускага народа. Аб гэтым сведчаць кнігі
І. Анацэвіча, М. Баброўскага, І. Даніловіча, І. Лялевеля, Т. Чацкага, Ю. Ярашэ-віча і інш. У апошнія гады існавання з 47 прафесараў 36 былі ўраджэнцамі Бе-ларусі і Літвы. У сувязі з тым, што універсітэт стаў калыскай арганізатараў і ўдзельнікаў паўстання 1830-1931 гг., ён быў зачынены ў 1832 г.[7]

Развіццю прававой навукі на Беларусі садзейнічала таксама Полацкая ака-дэмія, створаная ў 1812 г. на базе Полацкага езуіцкага калегіума (заснаваны ў 1580 г.), якой былі нададзены правы універсітэта: яна мела права надаваць на-вуковыя ступені магістараў вольных навук і філасофіі, дактароў тэалогіі, цывіль-нага і кананічнага права. У 1820 г. акадэмія была зачынена.

У XIX - пачатку XX ст. пытанні гісторыі дзяржавы і права Беларусі закрана-ліся ў працах шматлікіх вучоных: А. Каравіцкага, Ю. Ярашэвіча, М. Кастамара-ва, М. Уладзімірскага-Буданава, М. Дашкевіча, М. Доўнар-Запольскага, Р. Дзем-чанкі, М. Каяловіча, І. Лапо, Ф. Леантовіча, М. Любаўскага, М. Максімейкі, І. Малі-ноўскага, Т. Чацкага, М. Ясінскага, Т. Нарбута і інш. Значнай заслугай вучоных з'яўляецца пошук мінулай дакументальна-прававой спадчыны (ствараюцца на-вуковыя цэнтры ў Пецярбургу, Вільні, Кіеве) і апублікаванне шматлікага даку-ментальна-прававога матэрыялу. Так, былі выдадзены «Беларускі архіў стара-жытных грамат» пад рэдакцыяй І.І. Грыгаровіча (ч. 1, 1824); «Зборнік Муханава» (1836); «Акты, якія адносяцца да гісторыі Заходняй Расіі» (1846-1853); «Акты, выдаваемыя Віленскаю археаграфічнаю камісіяю» (1865-1915), «Гісторыка-юрыдычныя матэрыялы...» (Віцебск, 1871-1906); «Русская историческая биб-лиотека» (1872-1927) і інш.

Асаблівая заслуга ў гэтай справе належыць І. Даніловічу, які ў верасні 1814 г. пачаў выкладаць у Віленскім універсітэце мясцовае (г. зн. беларуска-літоўскае)

права. Ён выявіў і апублікаваў шэраг помнікаў права Беларусі. Так, у 1826 г. апублікаваў тэкст Судзебніка 1468 г., падрыхтаваў да друку Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 г., а таксама збор дакументаў «Скарбніца актаў» (Вильна, 1860-1862), у якім змешчаны вытрымкі ці апісанне 2383 актаў па гісторыі дзяржавы і права Беларусі і Літвы.

У гэты перыяд некаторыя вучоныя пачалі прысвячаць сваю творчасць непасрэдна гісторыі Беларусі: праца А.В. Турчыновіча "Агляд гісторыі Беларусі са старажытных часоў" (СПб., 1857), кніга М.А. Каяловіча "Лекцыі па гісторыі Заходняй Расіі" (СПб., 1884), шэраг артыкулаў і зборнікаў А.П. Сапунова і інш.[8] Адзначым таксама, што многія выхадцы з Беларусі ўнеслі вялікі ўкпад у развіццё расійскай прававой навукі (У.Д. Спасовіч і Л.І. Петражыцкі і інш.).

Новы этап развіцця гісторыка-прававой навукі Беларусі звязаны з узнаўленнем беларускай дзяржаўнасці на пачатку XX ст. і адкрыццём у 1921 г. Беларускага дзяржаўнага універсітэта, у скпадзе якога функцыяніравала прававое аддзяленне. Першы рэктар БДУ У.І. Пічэта выдаў шмат навуковых прац, прысвечаных палітычнай, сацыяльна-культурнай, эканамічнай і прававой гісторыі Беларуси Вакол яго сфарміравалася кола даследчыкаў (А.В. Бурдзейка, В.Д. Дружчыц, Т.І. Забэлла, К.І. Таўсталес і інш.), якія распрацоўвалі шматлікія пытанні гісторыі Беларусі, у тым ліку і гісторыка-прававыя. Напрыклад, В.Д. Дружчыц глыбока даследаваў праблемы Магдэбургскага права на Беларусі.

У адчыненым у 1922 г. Інстытуце беларускай культуры разам з вывучэннем актуальных праблем дзяржаўна-прававога будаўніцтва на Беларусі (напрыклад, даследаванне прычын злачыннасці) разглядаліся пытанні прававой гісторыі, у кантэксце якой пачалося выданне дзяржаўна-прававых актаў XVI-XVII стагоддзяў, з Літоўскай метрыкі; выйшаў у свет трохтомны "Беларускі архіў" (1927-1930). Аднак у 1930-я гг. пачалася ідэалагічная кампанія барацьбы з т. зв. нацыяналдэмакратызмам, наступствам чаго стала рэпрэсіраванне шэрага вучоных (У.І. Пічэта, Р.Я. Парэчын, Н.М. Гуткоўскі, В.Д. Дружчыц і інш.) і скарачэнне навуковых даследаванняў. Цяжкі ўрон панесла прававая навука Беларусі і ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

Новы этап навуковых даследаванняў у галіне права пачаўся з узнаўленнем дзейнасці Акадэміі навук БССР (1944) і Мінскага юрыдычнага інстытута (у 1954 г. быў пераўтвораны ў юрыдычны факультэт БДУ). Працэс пашырэння правоў саюзных рэспублік у сферы законатворчасці ў другой палове 50-х гадоў XX ст. значна актывізаваў навуковая даследаванні. У рэспубліцы быў пакладзены пачатак новаму накірунку гісторыка-прававой навукі - гісторыі дзяржавы і права Беларускай ССР. Выходзяць кнігі С.П. Маргунскага «Государственное строительство БССР в годы восстановления народного хозяйства (1921-1925)» (1966) і інш. У 1958 г. выдадзена калектыўная праца «Очерки по истории государства и права БССР». У 1970-1976 гг. надрукаваны два тамы «Истории государства и права Белорусской ССР» (С.П. Маргунскі, І.І. Пацяружа, В.Н. Арцёмава, Ю.П. Броўка, М.В. Сторажаў, У.І. Семянкоў, У.І. Шабайлаў, Я.А. Юхо і інш.). У БДУ пачалі выкладаць вучэбную дысцыпліну - гісторыю дзяржавы і права Беларусі.

Кожнаму этапу развіцця гісторыка-прававой навукі ўласцівы характэрныя асаблівасці. Асабліва гэта праяўлялася на паваротных гістарычных рубяжах, калі ўзнікала неабходнасць пераасэнсавання мінулага з мэтай пазбегнуць папярэдніх памылак. Так, заканамерная актывізацыя навуковых даследаванняў з пачатку 90-х гадоў XX ст. прывяла да з'яўлення прац правазнаўцаў, гісторыкаў, філосафаў па праблемах гісторыі дзяржавы і права Беларусі і запаўнення некаторых "белых плямаў". У гэты перыяд друкуюцца артыкулы і кнігі старэйшага гісторыка права - прафесара Я. Юхо, у якіх разглядаюцца шматлікія праблемныя пытанні гісторыі дзяржавы і права Беларусі, даецца агульная характарыстыка развіцця беларускай дзяржаўнасці. У навуковых публікацыях гісторыкаўправазнаўцаў (А. Вішнеўскага, Т. Доўнар, У. Сільчанкі, С. Сокала, В. Шаўкапляс), філосафаў (В. Конана, І. Падокшына), гісторыкаў (А. Грыцкевіча, 3. Капыскага) і іншых беларускіх вучоных разглядаюцца (або закранаюцца ў кантэксце агульных праблем гісторыі Беларусі) пытанні прававой гісторыі.

Выходзіць шэраг манаграфій, навучальных дапаможнікаў па гісторыі дзяржа-вы і права Беларусі, у тым ліку па гісторыі грамадзянскага і крымінальнага права Беларусі (Т. Доўнар), канстытуцыйнага права (Р. Васілевіч, Т. Доўнар, Я. Юхо) і інш. Навукоўцы прымаюць удзел у падрыхтоўцы энцыклапедычных выданняў: "Юрыдычны слоўнік" (1989), "Мысліцелі і асветнікі Беларусі" (1995). "Энцыкла-педыя гісторыі Беларусі" (1994-2004). Актывізацыі навуковых даследаванняў садзейнічала перавыданне Статута 1588 г. (1989), у якім прымалі ўдзел (і з'яў-ляліся перакладчыкамі на рускую мову) Я. Юхо, Т. Доўнар. У 2003 г. быў пера-выдадзены Статут 1566 г. (Я. Юхо, Т. Доўнар, У. Сатолін).

Гісторыка-прававой навуцы Беларусі на ўсіх этапах яе развіцця былі харак-тэрны асаблівасці, некаторыя з іх актуальныя і зараз. На папярэдніх этапах да-лёка не ўсе пытанні беларускай гісторыі даследаваліся. Часам яны вывучаліся павярхоўна і аднабакова, гістарычныя падзеі трактаваліся адвольна, большая ўвага надавалася негатыўным момантам жыцця беларускага народа ў дакаст-рычніцкі перыяд. Шэраг праблем, канкрэтных гістарычных падзей і фактаў, а таксама персаналій замоўчваўся. Нават зараз у некаторых расійскіх падручні-ках па гісторыі дзяржавы і права ўтрымліваюцца скажоныя звесткі пра Бела-русь, замоўчваюцца пэўныя факты і падзеі, некаторыя пытанні разглядаюцца тэндэнцыйна.

Даследаванне прававой спадчыны, якое з'яўляецца важнейшай задачай гіс-торыка-прававой навукі, на папярэдніх этапах стрымлівалася некаторымі фак-тарамі: так, шматлікія помнікі права Беларусі, якія з'яўляюцца найбольш даклад-нымі і надзейнымі крыніцамі ведаў аб узроўні прававой культуры грамадства, аб палітычным становішчы дзяржавы, яе дзяржаўным ладзе і сацыяльна-эканаміч-ных адносінах, становішчы ўсіх пластоў насельніцтва, у мінулы дарэвалюцыйны і савецкі перыяды не перадрукоўваліся. Таксама іншыя дакументальна-права-выя і архіўныя матэрыялы не заўсёды былі даступныя даследчыкам.

У сувязі з гэтым існавалі шматлікія прабелы ў гісторыі дзяржавы і права Беларусі, некаторыя з якіх, нягледзячы на публікацыі апошніх гадоў, застаюцца і зараз. Асабліва гэта тычыцца праблемных пытанняў развіцця гісторыка-права-вой навукі, гісторыі органаў улады і суда, эвалюцыі асобных інстытутаў і галін права і інш. Становішча ўскладняецца і тым, што ў іншых краінах (асабліва ў суседніх, чыя гісторыя непасрэдна звязана з гісторыяй Беларусі) даследаванні праводзяцца больш актыўна, а ў апошняе дзесяцігоддзе яны актывізаваліся, аб чым сведчаць навуковыя публікацыі, абароненыя дысертацыі, колькасць наву-ковых часопісаў і інш.

Новыя прагрэсіўныя тэндэнцыі ў развіцці дзяржаўнасці Беларусі на пачатку 90-х гг. XX ст. спрыялі актывізацыі навуковых даследаванняў і арыентацыі да-следчыкаў на праўдзівае і плюралістычнае асвятленне гістарычных працэсаў. У гісторыка-прававой навуцы дагматызм замяніўся крытычным падыходам да ідэалагічных міфаў, схем. Беларускія вучоныя пачалі пераасэнсоўваць уласную гісторыю, праяўляць асабістае разуменне гістарычных падзей і працэсаў. На-прыклад, частку створаных у беларускай гісторыі міфаў развянчаў М. Ерма-ловіч. Аднак застаюцца праблемнымі шматлікія пытанні гісторыка-прававой на-вукі Беларусі, таксама як і значныя прабелы ў ёй.

Імкненне вучоных у апошнія дзесяцігоддзі адысці ад фармацыйнага прынцы-пу адносна перыядызацыі гістарычнага працэсу прывяло да замены яго цывілі-зацыйным падыходам, неабходнасць якога асабліва абгрунтоўваў А. Тойнбі. Аднак у апошні час вучоныя слушна выказваюць сумненні адносна існавання ў чыстым выглядзе той ці іншай фармацыі і звяртаюць увагу на тое, што "фарма-цыя" і "цывілізацыя" не выключальныя, а ўзаемадапаўняльныя паняцці. У ме-жах айчыннай гісторыі цывілізацыйнага падыходу часам недастаткова і ўзнікае патрэба ў больш вузкіх, канкрэтных перыядах.

Па-за ўвагай навукоўцаў савецкага перыяду засталася праблема ўзаема-дзеяння культуры Беларусі (у тым ліку і прававой) з заходнееўрапейскай куль-турай. Новыя прагрэсіўныя працэсы на Беларусі праходзілі не ізалявана, а ў рэ-чышчы найважнейшых з'яў, уласцівых усёй еўрапейскай супольнасці народаў, хаця яны мелі пэўныя асаблівасці і адметныя рысы. У апошнія гады пачалося

вывучэнне пытанняў прававога ўзаемадзення еўрапейскіх дзяржаў у кантэксце інтэграцыйных працэсаў, у тым ліку і ў сферы гісторыі права.

Трэба адзначыць, што даследаванне прававой гісторыі патрабуе звяртання як непасрэдна да прававых нормаў і інстытутаў, так і да эканамічных і палітычных працэсаў у грамадстве, таму што нельга пазнаць сутнасць прававой з'явы без уліку практыкі і тых фактараў рэчаіснасці, якія ўплывалі на развіццё права. Напрыклад, вялікае значэнне меў такі кпасавы фактар, як становішча насельніцтва. На працягу стагоддзяў зямлёй валодалі феадалы, колькасць якіх складала невялікі працэнт адносна ўсяго насельніцтва, а незадаволенасць сялянства было тым актыўным фактарам, які значна ўплываў на ўвесь гістарычны працэс. Зямельныя рэформы на Беларусі ў XVI, XIX, XX ст. нязначна паляпшалі сітуацыю, а часам і ўскладнялі яе, прыводзілі да сацыяльных выбухаў, паўстанняў, а потым да рэвалюцый. У мінулыя дзесяцігоддзі таксама мала ўвагі звярталася на такі значны фактар гістарычнага развіцця, як нацыянальна-вызваленчы рух, хаця ён аказваў і аказвае значны ўплыў на развіццё дзяржаў і сусветны гістарычны працэс.

З нацыянальнымі прававымі пытаннямі цесна пераплецены рэлігійныя, сведчаннем чаму з'яўляецца ўся сусветная, у тым ліку і беларуская, гісторыя. У старажытны перыяд, калі на змену паганству на Беларусі прыйшла хрысціянская рэлігія візантыйскага накірунку, рэзка змяніўся менталітэт народа. Затым з XIV ст. прымусовым шляхам уводзіцца новы, заходні накірунак хрысціянства - каталіцызм, а з XVI ст. у перыяд Рэфармацыі ўзнікае моцная плынь пратэстантызму. Усё гэта актыўна ўплывала на свядомасць грамадства. Пасля далучэння Беларусі да Расіі адбываюцца новыя змены ў светапоглядзе грамадства і народным менталітэце. Рэлігійны фактар на Беларусі ўвесь час значна ўплываў на ўсе грамадскія працэсы. Знакаміты расійскі гісторык права адзначаў, што ў 1990-я гг. у новай ідэалогіі пачала шукаць сваё месца і царква (хрысціянская, мусульманская і інш.), а праваслаўная царква прама заяўляла прэтэнзіі на месца, якое раней належала КПСС[9]. У сувязі з тым, што рэлігійнае пытанне працягвае заставацца актуальным, павінна быць звернута ўвага на вывучэнне ўздзеяння царкоўна-рэлігійнага жыцця на ход гістарычнага працэсу, праблемы ўзаемаадносін царквы і дзяржавы, узаемаадносін розных рэлігійных канфесій і інш.

Нацыянальна-дзяржаўны падыход, пры якім вывучэнне гісторыі ўласнага народа з'яўляецца прыярытэтным накірункам навуковых даследаванняў, актуалізаваўся ў наш час, калі Беларусь актыўна будуе суверэнную прававую дзяржаву. Галоўнай падставай наяўнасці ўласнай аб'ектыўнай гісторыі стала заканадаўчае замацаванне ў дзеючай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь факта шматвяковага існавання беларускага этнасу і беларускай дзяржаўнасці як суб'ектаў сусветнай гісторыі.

Спынімся яшчэ на адной праблеме (і асаблівасці) беларускай гісторыі, якая адгукваецца да гэтага часу, - назве беларускага народа, якая змянялася на працягу стагоддзяў. Існуе праблема непаразумення беларускіх і некаторых літоўскіх даследчыкаў. Апошнія на падставе назвы ("Вялікае княства Літоўскае", "Літва") і іншых абставін схільны прыпісваць сабе гісторыю гэтай дзяржавы. У гэтым ім "дапамагаюць" кнігі замежных гісторыкаў права, якія актыўна перавыдаюцца ў нас (напрыклад, Аннерс Э. История европейского права. М., 1994) і дзе гаворыцца аб гісторыі так званага "літоўскага" права, або аб "Літоўскіх Статутах", што не ўсведамляецца як гісторыя Беларусі.

На сучасным этапе поле дзейнасці для навукоўцаў вельмі шырокае. Асабліва актуальнымі з'яўляюцца такія праблемы гісторыка-прававой навукі, як эвалюцыя палітычных інстытутаў, у тым ліку органаў улады і суда, гісторыя беларускага канстытуцыяналізму і парламентарызму, якія можна разглядаць у кантэксце праблемы ўзнікнення ВКЛ і ролі ў гэтай дзяржаве беларускага этнасу і культуры беларускага народа, Магдэбургскае права на Беларусі як спецыфіка спалучэння мясцовых і агульнадзяржаўных інтарэсаў, гісторыя прававой думкі, эвалюцыя асобных інстытутаў і галін права і шмат іншае. Фактычна патрабуе даследавання і пераасэнсавання ўвесь савецкі перыяд гісторыі дзяржавы і права Беларусі, калі лічылася, што грамадскія навукі (асабліва гістарычныя) па сваёй прыродзе

павінны быць партыйнымі. Аднак узнікае новае пытанне: ці могуць увогуле грамадскія навукі быць незалежнымі ад усялякай ідэалогіі?

Менавіта вяртанне беларусаў да сваіх вытокаў, як і ўсведамленне характару свайго ўласнага гістарычнага шляху, стала асновай новай канцэпцыі ідэалогіі беларускай дзяржаўнасці. На сучасным этапе аб'ектыўнасць навуковых даследаванняў будзе садзейнічаць не толькі развіццю прававой навукі, але і беларускай дзяржаўнасці.

1 Гл.: Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыкл. даведнік. Мн., 1995. С. 620-621.

2 Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI—XVIII стст. (Хрэстаматыя) / Пад рэд. Т.І. Доўнар. Мн., 2005. С. 14.

3 Гл.: Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. Мн., 1989. Раздз. 4.

4 Там жа. Раздз. 4, арт. 1.

5 Гл.: Шалькевіч В.Ф. Віленскі універсітэт // Энцыкапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн., 1994. Т. 2. С. 287.

6 Гл.: Шалькевіч В. Ф. Там жа. С. 288.

7 Гл.: Юхо Я.А. Гісторыяграфія гісторыі дзяржавы і права феадальнай Беларусі. Мн.,1999. С. 61.

8 Гл.: Чистяков О.И. О социальной ценности историко-правовых наук // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 2. Право. 1995. № 6. С. 10.

9 Гл.: Там жа. С. 11.

Паступіў у рэдакцыю 02.03.05.

***Таіса Іванаўна Доўнар*** - доктар юрыдычных навук, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.

*Г.А. ВАСИЛЕВИЧ*

## ОСОБЕННОСТИ ФОРМИРОВАНИЯ СОЦИАЛЬНОГО ПРАВОВОГО ГОСУДАРСТВА В ПЕРЕХОДНЫЙ ПЕРИОД

Отмечается противоречивость законодательства, что приводит к нарушению ряда конституционных принципов, которые являются основой формирования отношений между государством и человеком. Рассматриваются эффективные механизмы защиты прав человека (материально-правовые, процессуальные и институциональные формы и средства).

The article shows the contradictory character of legislation, which leads to the violation of a number of constitutional principles making the foundation of relations between state and man. Effective mechanisms of the defense of human rights (material and legislative, legal and institutional forms and means) are considered.

**I.** В современных конституциях, в том числе и государств, недавно обретших независимость, содержатся нормы о правовом, демократическом, социальном характере развития. Часто в них прямо констатируется, что соответствующая страна является демократическим, социальным, правовым государством. Однако для того, чтобы можно было сделать вывод: содержит ли конституция нормы и принципы правового, демократического, социального государства, необходимо проанализировать ее в соответствии с уже известными критериями. Отметим лишь, что в некоторых конституциях (например, Германии) закрепляется принцип социального государства, в других, чаще опирающихся на социалистическое прошлое, содержится обширный спектр социальных, экономических и культурных прав и свобод. С этой точки зрения Конституцию Республики Беларусь вполне можно назвать социальной конституцией.

Аналогично обстоит дело и с вопросом о правовом государстве. В конституции получили свое закрепление основные элементы такого государства: разделение властей, независимость судебной власти, политический плюрализм, приоритет прав и свобод человека и гражданина.

Однако недостаточно принять даже самый совершенный конституционный текст, важно обеспечить соответствие реальных отношений конституции.

Обратимся к социальным правам: проблема их финансирования на определенном этапе, как отмечает А. Бланкенагель, «становится проблемой демократии и разделения властей»[1].

Известно, что обеспечение таких прав, как право на достойный уровень жизни (достаточное питание, одежду, жилье и постоянное улучшение необходимых для этого условий (ст. 21 Конституции), на охрану здоровья (ст. 45), на социаль-